**Андрэй Вашкевіч**
(Гародня)

## Беларускае насельніцтва Аўгустоўскага павета Сувалкскай губерні (др. п-ва XIX – пач. XX стст.)

Тэрыторыя Аўгустоўшчыны, калі казаць аб яе беларускім насельніцтве, заўсёды была своеасаблівай terra incognita. Пра беларусаў, што жылі ў Аўгустоўскім павеце на працягу ўсяго XIX стагоддзя амаль не пісалі этнографы, мовазнаўцы і гісторыкі. Некалькі разважанняў прафесара Яўхіма Карскага ды сухія лічбы ў статыстычных зборніках гэта бадай усё, што засталося для наступных пакаленняў. Праўда ў бурлівыя гады барацьбы за беларускую дзяржаўнасць Аўгустоўскі павет Сувалкскай губерні неаднаразова згадваўся як неад'емная частка БССР і БНР. Прэм'ер-міністр урада БНР Антон Луцкевіч у пачатку 1919 года нават паспеў даслаць з Гродна польскаму ўраду ноту аб неправамерным далучэнні Аўгустоўшчыны да польскай дзяржавы[1]. Але ўжо праз некалькі гадоў, калі польская рэспубліка канчаткова замацавала сваю ўладу на землях Заходняй Беларусі, звесткі пра беларусаў у Аўгустоўскім павеце становяцца ўсё больш спарадычнымі і хутка знікаюць зусім. Ва ўрадавай статыстыцы і на этнаграфічных картах Другой Рэчы Паспалітай Аўгустоўшчына фігуруе як тэрыторыя з суцэльным польскім насельніцтвам. Задачай гэтай працы ёсць: прааналізаваўшы даступныя крыніцы,

[1] *Адраджэнне. Гістарычны альманах*, Мінск 1995, с. 254–255.

хаця б коратка расказаць аб гісторыі беларусаў Аўгустоўскага павета, пачынаючы ад 1864 года (першая згадка аб усходнеславянскім насельніцтве Аўгустоўшчыны менавіта як аб беларусах) і да 1921 года, калі па рэзультатах перапісу, што праводзіўся ў межах Другой Рэчы Паспалітай, беларусы ў Аўгустоўскім павеце пераўтвараюцца ў мізэрную этнічную супольнасць.

Аўгустоўскі павет Сувалкскай губерні Царства Польскага з'яўляўся штучным адміністратыўным утварэннем, якое ўзнікла ў выніку гвалтоўнага падзелу земляў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII стагоддзя. У 1795 годзе Прусія разам з этнічнымі польскімі землямі захапіла Беласточчыну і заходнюю частку Гродзенскага павета, што ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага і былі заселеныя асноўным чынам усходнеславянскім насельніцтвам. Пасля разгрому Прусіі Напалеонам у 1807 годзе Беласточчына адышла да Расійскай Імперыі, але захад былога Гродзенскага павета Троцкага ваяводства ВКЛ быў уключаны ў Герцагства Варшаўскае, а ў 1815 годзе ўвайшоў у аўтаномнае ў складзе Расіі Царства Польскае. Аўгустоўскі павет акурат і аб'яднаў паўночную частку Падляшскага ваяводства былой Кароны Польскай і захад Гродзенскага павета, тэрыторыі вельмі розныя паводле свайго этнічнага складу. Такім чынам паміж 1815 і 1915 гг. беларусы на землях Царства Польскага жылі толькі ў Аўгустоўскім павеце, дзе знаходзіліся ў чужым этнічным атачэнні і былі аддзеленыя ад усяго беларускага этнасу мяжой Царства Польскага і Паўночна-Заходніх губерняў (Гродзенскай губерні).

Польскі гісторык Е. Вісьнеўскі, падрабязна прааналізаваўшы гісторыю засялення будучага Аўгустоўскага павета ў XV--XVIII стст., прыйшоў да высновы аб двух асноўных напрамках засялення Аўгустоўшчыны: усходнеславянскім – русінскім з паўднёвага-ўсходу і заходнеславянскім з паўднёвага-захаду[2]. У самым пачатку XVI стагоддзя, калі Падляшша яшчэ належала Вялікаму княству Літоўскаму, усходнія славяне заснавалі свае паселішчы нават у ваколіцах прускай мяжы, засяліўшы такім чынам усю тэрыторыю Аўгустоўшчыны, аднак пасля 1569 года, калі Падляшша перайшло да Кароны Польскай, русіны там хутка былі асіміляваныя палякамі, што рухаліся з паўднёвага-захаду[3].

[2] J. Wiśniewski, *Dzieje osadnictwa w powiecie augustowskim od XV do końca XVIII wieku*, [w:] *Studia i materiały do dziejów Pojezierza Augustowskiego* (pod red. J. Antoniewicza), Białystok 1967, s. 13–294.

[3] Там жа, с. 131.

Усваю чаргу на захадзе Гродзенскага павета, на землях, што прымыкалі непасрэдна да Нёмана, Ласосны і Бобры, стварылася зона суцэльнага ўсходнеславянскага засялення, аддзеленая ад этнічных палякаў агромністым масівам Аўгустоўскай пушчы. Як бачым, яшчэ ў познім сярэднявеччы на тэрыторыі будучага Аўгустоўскага павета склалася этнічная сітуацыя, якая пацвярджаецца крыніцамі, што паходзяць з другой паловы XIX стагоддзя: на захадзе павета палякі, на ўсходзе беларусы, у цэнтры захаваная да сённяшняга дня Аўгустоўская пушча з невялікай зонай беларуска-польскіх этнічных кантактаў па цячэнню ракі Бобры.

Яшчэ адной важнейшай асаблівасцю гісторыі беларусаў Аўгустоўскага павета ў XIX – пач. XX стст. стала іх рэлігійнае жыццё. Паводле канфесійнай прыналежнасці беларускае насельніцтва было мяшаным. Частка належала да рыма-каталіцтва (парафіі Адамавічы, Селіванаўцы, Тэалін), але пераважная большасць спавядала грэка-каталіцтва. На паўднёва-ўсходнім ускрайку Аўгустоўскага павета існавала 7 уніяцкіх прыходаў: Баля, Галынка, Сапоцкін, Рыгалаўка, Перстунь, Лабна, Ліпск[4]. Яшчэ адзін прыход знаходзіўся ў Аўгустове. Пасля ліквідацыі уніі ў 1839 годзе ў Паўночна-Заходнім краі жыхары гэтых васьмі прыходаў (у 1840 годзе прыкладна 7,5 тыс. чал.) на працягу яшчэ 36 гадоў заставаліся апошнімі беларусамі грэка-каталікамі. У праваслаўе іх перавялі толькі ў пачатку 1875 года разам з уніятамі, што жылі на Холмшчыне і Люблiншчыне. Аднак з аднаго боку рэлгійны прыгнёт імперскай улады, а з другога боку безупынная агітацыя Каталіцкага касцёла на карысць польскасці сфарміравалі ў беларусаў Аўгустоўскага павета надзвычай варожае стаўленне да праваслаўя. Большасць пераведзеных прымусам у праваслаўе уніятаў Аўгустоўшчыны адразу была запісаная ўладамі ў лік „упорствующих”. Пачалася працяглая трыццацігадовая барацьба праваслаўных павета за магчымасць пераходу ў рыма-каталіцтва, якое ўспрымалася імі як вера найбліжэйшая да уніяцтва. Гэтая барацьба завяршылася ў 1905 годзе, аб чым мы раскажам пазней.

Першыя звесткі аб беларусах Аўгустоўскага павета прыводзіць у 1864 годзе падпалкоўнік А. Ф. Рыцціх у сваёй працы *Приложение к материалам для этнографии Царства Польскаго.* Карыстаючыся моўным прынцыпам вызначэння этнічнай прыналежнасці, Рыцціх налічвае ў Аўгустоўскім павеце 23 760 бе-

[4] F. Rzemieniuk, *Unickie szkoły początkowe w Królestwie Polskim i w Galicji 1772–1914*, Lublin 1991, s. 226–228.

ларусаў, на жаль не лакалізуючы іх па гмінах павета[5]. Асабліва цікава адзначыць, што Рыцціх згадвае паўднёвых славян нават яшчэ на паўднёвым-захадзе Аўгустоўскага павета і далей на поўдзень у ваколіцы Райграда, чаго мы не знойдзем у пазнейшых даследчыкаў. „Всё это население называет себя племенем Русь, употребляя белорусское наречие, которое можно встретить ещё южнее в Ломжинском уезде", – піша ён[6].

Самай каштоўнай крыніцай інфармацыі аб беларускім насельніцтве Аўгустоўскага павета, яго колькасці і рассяленні сталі *Списки населённых мест Сувалкской губернии как материал для историко-этнографической географии края*, сабраныя Э. А. Вальтэрам і надрукаваныя ў Санкт-Пецярбургу ў 1901 годзе. *Списки...* складаліся на аснове разасланых у 1888 годзе Э. А. Вальтэрам па гмінах губерні анкетаў, якія ўтрымоўвалі графы аб нацыянальнасці, мове, пісьменнасці і веравызнанні жыхароў кожнага населенага пункта ў той ці іншай гміне[7]. Вынікі гэтай працы, датычныя рассялення беларусаў у Аўгустоўскім павеце, прадстаўлены ў табліцы № 1. Аднак вялікая падрабязнасць спісаў Э. А. Вальтэра дае нам магчымасць шмат у чым перагледзець і ўдакладніць зробленае ім, тым больш што на месцах анкеты запаўняліся гміннымі чыноўнікамі, часцей за ўсё пазбаўленымі навуковай аб'ектыўнасці ў вырашэнні такога няпростага на нашых землях пытання, як нацыянальная прыналежнасць насельніцтва.

Разгледзім кожную гміну паасобку[8].

1. Горад Аўгустаў. З больш чым 10 тыс. насельніцтва налічваецца ўсяго 56 беларусаў. Безумоўна, колькасць беларусаў у гэтым адміністратыўным і эканамічным цэнтры Аўгустоўскага павета павінна была быць значна большай, але ўдакладніць вышэйпамянёную лічбу мы не маем ніякай магчымасці.

2. Гміна Барглаў. Беларусы не згадваюцца. Усходнеславянскае насельніцтва было асімілявана яшчэ ў др. п-ве XVI – XVII стст.

[5] Е. Ф. Карский, *Заметки по белорусским говорам*, [у:] *Труды по белорусскому и другим славянским языкам*, Минск 1962, с. 380.

[6] Цытуецца па: *Этнографическая карта Белорусскаго племени*, составил Е. Ф. Карский, Петроград 1917, с. 10.

[7] *Списки населённых мест Сувалкской губернии как материал для историко-этнографической географии края*, собрал Э. А. Вольтер, Санкт-Петербург 1901, с. 1–3.

[8] Звесткі па Аўгустоўскім павеце падаюцца ў Э. А. Вальтэра на старонках 87–111.

**Табліца 1.** Рассяленне беларусаў у Аўгустоўскім павеце па Э. А. Вальтэру

| гміна | беларусы | % беларусаў ад агульнай колькасці насельніцтва |
|---|---|---|
| Аўгустаў горад | 56 | 0,5 |
| Барглаў | 0 | 0 |
| Даўспуда | 0 | 0 |
| Кольніца | 0 | 0 |
| Шчэбра-Альшаны | 632 | 9 |
| Баля-Велькая | 5 382 | 96 |
| Лабна | 2 321 | 51 |
| Кур'янка | 4 133 | 97 |
| Галынка | 4 316 | 76 |
| Валавічоўцы (Сапоцкін) | 910 | 11 |
| Петрапаўлаўск (Ліпск) | 295 | 9 |
| Штабін | 0 | 0 |
| Дэмбова | 3 192 | 99 |
| разам | 21 237 | 27 |

3. Гміна Шчэбра-Альшаны. З 632 чалавек, запісаных беларусамі, мінімум 344 чал. – рускія стараверы філіпаўскага толку, што перасяліліся на Аўгустоўшчыну ў канцы XVIII – першай п-ве XIX стст. Наконт астатніх 288 беларусаў рыма-каталікоў меркаваць цяжка; гэта або нашчадкі старавераў, або этнічных беларусаў, перасеrange сюды ў час рэформаў А. Тызенгаўза (гэтая гміна, як і ўсе ніжэйпамянёныя, да канца XVIII ст. уваходзіла ў склад Гродзенскага павета).

4. Гміна Даўспуда. Беларусы не згадваюцца, хаця першымі насельнікамі тэрыторыі гэтай гміны былі менавіта русіны з ваколіц Гродна. Яшчэ ў 1513 годзе Багдан Грынковіч Валовіч заснаваў двор Даўспуда, паставіў там праваслаўную царкву і пачаў перасяляць туды русінаў са сваіх валоданняў Баля, Русота, Ліпск-Мураваны, што каля Гродна[9]. Як і ў гміне Барглаў, усходнія славяне асіміляваліся яшчэ ў сярэднявеччы.

[9] J. Wiśniewski, *Dzieje osadnictwa w powiecie augustowskim od XV do końca XVIII wieku*, s. 94–95.

5. Гміна Кольніца. Беларусы не згадваюцца. Паводле Е. Вісьнеўскага, яе актыўнае засяленне пачалося толькі ў XVIII ст. выхадцамі з Аўгустова. У 1758 годзе кароль Аўгуст II Моцны прызнаў землі на поўдзень ад возера Сайна валоданнямі горада. Аднак у паўднёвай частцы гміны існавалі вёскі, што засяляліся з усходу яшчэ ў канцы др. п-вы XVI – пач. XVII стст.[10]

6. Гміна Дэмбова. У гміне 3 192 беларусы, 26 жыдоў і ніводнага паляка. Гэта хутчэй за ўсё памылковае рашэнне перапісчыка, бо ў графе „мова” па-беларуску размаўляюць усяго 1 424 чал. (пры чым беларуская мова значна спольшчана). Беларускамоўнымі паказаныя жыхары ўсходніх вёсак гміны, а вёскі на захад ад Аўгустоўскага канала (Полькава, Ясянова, Капыткова, што да 1795 года былі ў Падляшскім ваяводстве) – польскамоўныя. Такім чынам лічыць у гэтай гміне больш чым 1 424 беларусы мы не можам.

7. Гміна Штабін. Беларусы не згадваюцца. Е. Вісьнеўскі гаворыць аб мяшаным засяленні тэрыторыі гэтай гміны мазужанамі з паўднёвага-захаду і русінамі з поўдня і ўсходу[11]. Яшчэ ў др. п-ве XVIII ст. у Штабіне існавала уніяцкая царква, на месцы якой быў пазней узведзены касцёл[12]. Безумоўна, у канцы XIX ст. беларусы складалі значную частку насельніцтва гэтай гміны.

8. Гміна Петрапаўлаўск. Беларусаў усяго 295, аднак беларускай мовай карыстаюцца 1 826 чалавек, бадай што ўсё насельніцтва гміны за выключэннем вёскі Ястшэмбнэ, геаграфічна аддзеленай ад усяго абшару суцэльнага ўсходнеславянскага засялення. У выніку беларусаў у гміне не менш 1 826 чалавек.

9. Гміна Кур’янкі. 4 133 беларусы па нацыянальнасці (4 132 па мове). Палякамі запісаныя толькі жыхары фальваркаў, сядзібаў у лесе і на Аўгустоўскім канале.

10. Гміна Галынка. 4 316 беларусаў па нацыянальнасці і 4 668 па мове. Каталікі запісаныя беларускамоўнымі палякамі. Да ліку ўласна палякаў належаць толькі ўладальнікі маёнткаў, а не сяляне. Такім чынам беларусаў у гміне не менш 4 668 чал.

11. Гміна Лабна. Жыхары ўсіх праваслаўных вёсак – беларусы (2 321 чал.), каталіцкіх – палякі (2 152 чал.). Гэта безумоўна не адпавядае рэчаіснасці, бо ўсе заселеныя „палякамі” каталіцкія вёскі ў парафіі Адамавічы былі заснаваныя яшчэ ў канцы XVI ст. дробнай русінскй шляхтай, якая таксама не магла карыстацца

[10] Там жа, с. 154–157.

[11] Там жа, с. 157–158.

[12] Там жа, с. 245.

(і не карыстаецца зараз) польскай мовай, як гэта паказана ў спісах. Калі прыняць за колькасць беларусаў-каталікоў 2 000 чалавек (адкінуўшы буйных землеўласнікаў), то агульная колькасць беларусаў складзе не менш 4 321 чалавека.

12. Гміна Валавічоўцы. Як і ў папярэдняй гміне праваслаўныя – беларусы (910 чал.), каталікі – палякі (4 326 чал.). Нават калі дапусціць магчымасць перасялення заходнеславянскага насельніцтва ў мяст. Сапоцкін і яго ваколіцы, хаця такіх фактаў крыніцы не ўтрымоўваюць, а Сапоцкін знаходзіцца ў зоне суцэльнага ўсходнеславянскага засялення, то лік палякаў павінен быць зменшаны максімум у некалькі разоў. На нашу думку ў гміне Валавічоўцы было не менш 4 000 беларусаў.

13. Гміна Баля-Велькая. Беларусаў 5 382 чал. Гэта і праваслаўныя і каталікі. Палякі толькі ў фальварках і сядзібах.

Агледзеўшы такім чынам працу Э. А. Вальтэра, прыходзім да наступных высноваў:

Па-першае. У заходніх гмінах павета беларусаў ужо няма.

Па-другое. У гмінах Дэмбова, Штабін, Кольніца і Шчэбра-Альшаны, якія і былі месцам кантакту асноўных плыняў засялення Аўгустоўшчыны з захаду і ўсходу, беларусы ці не згадваюцца зусім, ці фігуруюць як значна спольшчаныя, што сведчыць аб хуткіх працэсах асіміляцыі беларускага насельніцтва гэтых гмін у канцы XIX ст.

Па-трэцяе. На ўсходзе павета ў гмінах Петрапаўлаўск, Валавічоўцы, Баля-Велькая, Галынка, Лабна і Кур'янка, аддзеленых ад іншай часткі павета масівам Аўгустоўскай пушчы, захоўвалася амаль выключна беларуская маса насельніцтва. Большасць каталікоў запісалася палякамі і ў гэтых гмінах, але як сведчаць запісы з гмінаў Петрапаўлаўск, Галынка і Баля-Велькая каталікі таксама карысталіся беларускай мовай. Польскамоўнасць каталікоў гмін Валавічоўцы і Лабна з'яўляецца хутчэй за ўсё рэзультатам непрафесійнага падыходу перапісчыкаў да сваёй справы.

Вынікі першага ўсерасійскага перапісу 1897 г. былі згрупіраваныя на жаль толькі па паветах Расійскай Імперыі, таму мы не можам на іх аснове меркаваць аб рассяленні беларусаў у межах асобных гмінаў Аўгустоўскага павета. Ва ўсім Аўгустоўскім павеце ў 1897 г. жыло 25 712 беларусаў (32,46% ад агульнай колькасці насельніцтва), з іх 11 196 праваслаўных і 14 503 каталікоў[13].

[13] *Первая всеобщая перепись населения Российской Империи, 1897 год*, том LIX, *Сувалкская губерния*, Санкт-Петербург 1904, с. IX, 72, 74.

Летам 1901 г. у Аўгустоўскім павеце пабываў прафесар Яўхім Карскі, які наведаў Ліпск, Галынку і Сапоцкін і, прааналізаваўшы гаворкі мясцовага насельніцтва, прыйшоў да выніку аб бясспрэчнай прыналежнасці жыхароў усходніх гмінаў павета да ліку беларусаў. „Оказывается, – пісаў ён, – белорусы живут здесь сплошной массою по соседству с Гродненским и Сокольским уездами, примыкая с востока к реке Неману, с юга к реке Бобру и устью Лососны; на северо-западе белорусы в некоторых местах переходят даже Августовский канал, простираясь почти до г. Сейн и Августова. Южнее Августова белорусы до с. Красный Бор (в 14 верстах от Липска)”[14].

Бачна, што калі беларускую мову жыхароў Аўгустоўскага павета Я. Карскі вывучаў непасрэдна на месцы (чым асабліва каштоўныя яго назіранні), то паўночна-заходнюю мяжу рассялення беларусаў вызначаў на аснове звестак мясцовых жыхароў ці ўжо цытаванага намі Э. Вальтэра, бо і Ліпск, і Галынка, і Сапоцкін, дзе быў Я. Карскі, знаходзіліся ў глыбіні беларускай этнічнай тэрыторыі. Такім чынам паводле Я. Карскага беларускімі былі ў Аўгустоўскім павеце гміны Петрапаўлаўск, Валавічоўцы, Баля-Велькая, Галынка, Лабна і Кур'янка. Праз два гады ў першым томе *Беларусаў* Я. Карскі вызначыў мяжу рассялення беларусаў крыху іначай: „По Сувалкской губернии граница белорусского племени идёт от р. Немана на Копцёво к Августовскому каналу; затем по системе канала до г. Августова и далее по р. Нети; до границы с Гродненской губернией”[15]. Тое ж самае паўтарыў ён у *Этнографической карте беларусскаго племени*, што ўбачыла свет праз 14 гадоў і адлюстраваў графічна, далучыўшы да беларусаў насельніцтва гмін Кольніца, Штабін і Дэмбова.

Пакінуў прафесар Я. Карскі яшчэ некалькі цікавых назіранняў, на якія варта звярнуць увагу асабліва ў святле тых падзеяў, што разгарнуліся ў Аўгустоўскім павеце праз некалькі гадоў. „Все белорусы, населяющие отмеченную местность, считаются или православными, или католиками, но из первых большинство „упорствующие”. В Августовском уезде православные приходы следующие: Лабно, Балля, Церковная [Баля-Царкоўная – адзін прыход – А. В.], Рыгаловка, Голынка, Липск и Сопоцкин [Я. Карскі чамусьці абмінуў прыход Перстунь – А. В.]. К каждому при-

[14] Е. Ф. Карский, *Заметки по белорусским говорам*, с. 381.

[15] Я. Карскі, *Беларусы*, Мінск 2001, с. 42.

надлежит очень много деревень. И в некоторых католических приходах большинство населения белорусы... Оказывается, что речь населения здесь такая же, как и в соседних местах Гродненской губернии (в Сокольском и Гродненском уездах). При чём католики, а также рьяные из упорствующих легко переходят на польскую речь; по-польски (но очень неумело) они часто говорят не только с „начальством", но даже со своими священниками"[16]. Як вынікае з гэтай цытаты, беларусы, што да 1875 года з'яўляліся уніятамі, ніколі не пакідалі жадання вярнуцца ў веру бацькоў (а такой верай замест неіснаваўшага ўжо уніяцтва стала каталіцтва), ставіліся да праваслаўя адмоўна і ўсяляк намагаліся прадэманстраваць сваю польскасць, найперш ужываючы польскую мову ў размове з людзьмі з чужога асяроддзя.

Пасля таго, як 17 красавіка 1905 года імператарам Мікалаем II быў падпісаны знакаміты ўказ аб рэлігійнай талерантнасці, паводле якога можна было законна перайсці з праваслаўя ў іншую веру, пачаўся масавы пераход беларусаў-праваслаўных Аўгустоўскага павета ў каталіцтва. Паводле афіцыйных звестак рускага ўрада да Першай Сусветнай вайны ў каталіцтва ў Аўгустоўскім павеце перайшло 16 012 чал.[17] Такім чынам уступіў у завяршальную стадыю працэс, які можна назваць псеўдаасіміляцыяй, калі перайшоўшы ў каталіцтва беларусы Аўгустоўскага павета пачалі лічыць сябе палякамі.

У 1922 годзе ў Варшаве быў надрукаваны зборнік *Dzieje gospodarcze Polski porozbiorowej w zarysie*, дзе польскі даследчык Адам Закрэўскі (Adam Zakrewski) падаў колькасць беларусаў у пяці ўсходніх гмінах Аўгустоўскага павета на 1913 год (гл. табл. № 2), уласна кажучы ўсіх беларускіх тэрыторый, апрача гміны Кур'янка.

А. Закрэўскі і яго сааўтары карысталіся моўным прынцыпам вызначэння нацыянальнай прыналежнасці, за што былі востра заатакаваныя іншымі польскімі даследчыкамі, якія нават патрабавалі выдаліць гэтую кнігу з вольнага продажу[18]. На ўсходзе павета беларусы складалі безумоўную большасць, хаця іх кан-

[16] Е. Ф. Карский, *Заметки по белорусским говорам*, с. 381.

[17] *Праект мемарандума урада БНР дла Апостальскага Пасаду ад 7 лютага 1921 года*, [у:] *Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя*, Мінск – Мюнхен 1999, с. 511.

[18] Г. Гарэцкі, *Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы*, [у:] *Матар'ялы да географіі і статыстыкі Беларусі*, том першы, Менск 1928, с. 32.

**Табліца 2.** Колькасць беларусаў ва ўсходніх гмінах Аўгустоўскага павета паводле А. Закрэўскага

| гміна | беларусы | палякі |
|---|---|---|
| Баля-Велькая | 6 697 | 150 |
| Валавічоўцы (Сапоцкін) | 6 095 | 1 257 |
| Галынка | 5 787 | 36 |
| Лабна | 5 583 | 119 |
| Петрапаўлаўск (Ліпск) | 3 034 | 46 |
| Разам | 27 196 | 1 608 |

фесійная структура ў параўнанні з 1897 годам пацярпела значныя змены: 25 787 каталікоў і 1 409 праваслаўных[19].

Пачатак Першай Сусветнай вайны, нямецкая акупацыя і ўздым барацьбы за адраджэнне польскай дзяржавы толькі паскорылі працэсы, аб якіх мы ўжо гаварылі вышэй. К 1918 году ў канчатковы заняпад прыйшлі праваслаўныя прыходы, большасць цэркваў была перароблена мясцовымі жыхарамі ў касцёлы, што было непасрэдным адлюстраваннем іх польскай нацыянальнай свядомасці. Аднак нават у такіх спецыфічных умовах сярод насельнікаў Аўгустоўскага павета, хаця і слаба, але ўсё ж такі пачала шырыцца і беларуская нацыянальная свядомасць, найперш дзякуючы працы прыхільных да беларускай справы ксяндзоў. Прывядзем тут цалкам ліст невядомага селяніна з Аўгустоўскага павета, надрукаваны ў газеце „Krynica" у № 11 за 1920 год.

*Вёска Адамовічы, Аўгустоўскаго пав. Парафія наша і вёска чыста беларуская, як наагул ваколіцы Горадні. Заўсёды і паўсюды Беларусы – гэта бытцам забыты Богам і людзьмі народ, асабліва-ж гэта трэба сказаць аб нашым куце. Віленшчына і Горадзеншчына, ня кажучы ўжо нічога аб Меншчыне, былі заўсёды ў дужа лепшым палажэньні. У 1918 г. у Аўгустове была беларуская школа і мела маладога і спраўнаго вучыцеля. Езьдзіў ён зімою 1918 г. у Вільню на Беларускую Конферэнцыю. Шмат у чом немцы перашкаджалі яму пашырыць працу на беларускай ніве. У адамовіцкай парафіі шмат ёсць даўнейшых уніятаў, якія многа зажылі ўсялякага здзеку падчас касаваньня Уніі на Падлясю. Ня так далёкія часы, калі перад указам 1905 г. даўнейшыя уніяты з аколіц Адамовіч ночаю цішком ішлі да Гродны і тутака спавядаліся ў Фары. Днём было баязно*

[19] Там жа, с. 20.

*ураднікаў і жандармаў. Біскуп наш Карась жыве цяпер у Пуньску, аднак зносіны з ім у ваенны час вельмі трудныя. Ксяндзоў беларусаў у блізкіх ваколіцах німа, бо кс. праф. Бэто ў Ломжы, а кс. Тшаско [Trzasko] у Закапаным лечыцца. Сярод маладых ксяндзоў ёсьць больш беларусаў, дык і адраджэньне беларусаў у Аўгустоўшчыне і Сейненшчыне пойдзе хутчэй уперад. Трэба работнікаў! Хай Вільня і Менск не забываюцца аб сваіх братох.*

*Упорысты.*

Наступны перапіс адбыўся ў Аўгустоўскім павеце толькі восенню 1921 года. Праводзіўся ён урадам адроджанай Польшчы, дзяржаўныя ідэолагі і простыя чыноўнікі якой усяляк ганьбілі моўны прынцып вызначэння нацыянальнасці насельніцтва і максімальна карысталіся ўздзеяннем псеўдаасіміляцыйнага фактару, калі беларусы-каталікі свядома залічвалі сябе палякамі і аб якім мы ўжо гаварылі раней. Спецыфічныя гістарычныя ўмовы жыцця беларусаў у Аўгустоўскім павеце далі гэтаму фактару спраўдзіцца больш, чым у якім-небудзь іншым месцы Заходняй Беларусі. Колькасць беларусаў у цэлым па павеце склала ў 1921 годзе ўсяго 92 чалавекі з агульнай колькасці 62 384 жыхароў, што ў 288 разоў (!) менш, чым у 1897 годзе[20]. У пяці ўсходніх гмінах, аб якіх пісаў А. Закрэўскі, беларусаў стала толькі 49 чалавек, што агулам ў 555 разоў (!) менш, чым у 1913 годзе[21]. Прытым у гмінах Валавічоўцы, Галынка, Баля-Велькая і Петрапаўлаўск беларусы зусім адсутнічаюць, а ўсе 49 чалавек запісаліся беларусамі ў гміне Лабна (хутчэй за ўсё гэты маленечкі ўсплёск нацыянальнай свядомасці – рэзультат ахвярнай працы таго самага Упорыстага, бо яго родныя Адамавічы знаходзіліся акурат у гэтай самай гміне). У гміне Кур'янка, апошняй беларускай гміне Аўгустоўскага павета, жыло 4 беларусы, яшчэ 8 у Аўгустове. Астатнія 30 беларусаў жылі ў гмінах Даўспуда і Шчэбра-Альшаны. Ці гэтыя 30 чалавек былі запісаныя беларусамі стараверы, ці беларусы-перасяленцы, якія, апынуўшыся ў сапраўды польскім асяроддзі, і адчулі сваю нацыянальную асобнасць, мы не ведаем. Варта адзначыць, што нават апошнія праваслаўныя ўсходняй часткі Аўгустоўскага павета, а іх было ва ўсходніх гмінах у 1921 годзе яшчэ больш чым 500 чалавек, у асноўнай масе падалі сябе палякамі. Можна было б патлумачыць такое татальнае скарачэнне колькасці беларусаў у Аўгустоўскім павеце бежанствам лета 1915 года, аднак, як сведчыць перапіс 1921 г., колькасць на-

[20] Там жа, с. 162–163.
[21] Там жа, с. 154.

сельніцтва ў гмінах Петрапаўлаўск, Валавічоўцы, Баля-Велькая, Галынка і Лабна склала прыкладна 21 тыс. чалавек, што ўсяго на 7 тыс. (24%) менш, чым у 1913 годзе[22]. Гэтыя лічбы не ідуць ні ў якое параўнанне з прыведзенымі намі вышэй фактамі. Як бачым, амаль поўнае „знікненне" беларусаў у Аўгустоўскім павеце ў пачатку 1920-х гадоў можна патлумачыць толькі іх свядомым прылічэннем сябе да польскага этнасу.

Такім чынам шматгадовае супрацьстаянне паланізацыі ў асобе Каталіцкага касцёла і русіфікатарства ў асобе Праваслаўнай царквы і ўсяго дзяржаўнага апарату Расійскай Імперыі скончылася перамогай каталіцтва, а беларусы-уніяты Аўгустоўскага павета, якіх у 1875 годзе казакі бізунамі перахрышчвалі ў праваслаўе, разам з каталіцтвам, якое так прыгнятаў расійскі ўрад і якое так шанавалі яны, прынялі і польскую нацыянальную свядомасць, застаючыся беларусамі паводле паходжання і мовы. Па словах этнографа П. І. Кушнер, „многие белорусы-крестьяне подразделяли себя на людей «с польской верой» и людей «с русской верой». Национальное самосознание затемнялось и подменялось у них сознанием религиозной общности. А так как в условиях шовинистической национальной политики пилсудчиков белорусская интеллигенция не имела возможности развиваться, ибо белорусский язык был полностью устранён из официальной и общественной жизни, из школы, суда и церкви, то национальная идеология тех сотен тысяч белорусских крестьян-католиков, которые заблудились в дебрях таких отвлечённых для них понятий, как «национальная принадлежность» и «государственная принадлежность», не могла быть отчётливой"[23]. Такая сітуацыя была надзвычайна зручнай для афіцыйных колаў Другой Рэчы Паспалітай. Яшчэ ў канцы 1920-х гадоў беларускі даследчык Гаўрыла Гарэцкі пісаў: «Прызнаньне каталікоў і асабліва беларусаў-каталікоў за палякаў зьяўляецца як-бы непарушным падмуркам польскай нацыянальнай палітыкі, і як бачым, на жаль, і навукі»[24].

Дапаўняючы ўсё вышэйсказанае, можна дадаць, што ў нашым выпадку, калі пасля 1945 года ўсходняя частка Аўгустоўскага павета (мястэчка Сапоцкін і ваколіцы) апынулася ў складзе БССР, а пазней Рэспубліцы Беларусь, польскасць мяс-

[22] Там жа, с. 154.

[23] Цытуецца па: Е. Е. Ширяев, *Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах*, Минск 1991, с. 15.

[24] Г. Гарэцкі, *Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы*, с. 28.

цовых жыхароў набыла дэманстратыўны характар, ізноў як доказ прыналежнасці да Каталіцкага касцёла і барацьбы за рэлігійныя каштоўнасці (асабліва ва ўмовах савецкага грамадства). Такі стан рэчаў захоўваецца ў цэлым і па сённяшні дзень.